# НОВАМУ ГОДУ—НОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!




# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАУ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАУНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 1 (637) | Аўторак, 6 студзеня 1987 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


## КАМСАМОЛЬЦАМ БЫЦЬ У АВАНГАРДЗЕ

**Адышоў у гісторыю 1986 год — першы год XII пяцігодкі. Яго апошнія дні сталі важнай вяхой у жыцці камсамола ардэнаноснага Гомеля: адбыліся раённыя і гарадская справаздачна-выбарныя камсамольскія канферэнцыі. На іх падводзіліся вынікі работы за справаздачны перыяд, у святле патрабаванняў XXVII з'езда КПСС, на аснове шырокамаштабнай перабудовы псіхалогіі людзей, павышэння іх адказнасці за паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны праходзіла абмеркаванне новых задач камсамольскіх арганізацый у іх далейшай дзейнасці.**

XXIV справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя Цэнтральнага раёна г. Гомеля праходзіла 20-га снежня ў памяшканні абласнога драмтэатра.

На канферэнцыі са справаздачным дакладам райкома выступіў яго першы сакратар **Іван Бордак**.

У рабоце канферэнцыі ад камсамольскай арганізацыі нашага універсітэта прынялі ўдзел 87 дэлегатаў. Сакратар камітэта камсамола матэматычнага факультэта **Эла Савянок** выступіла пры абмеркаванні заслуханых справаздач.

На канферэнцыі выбраны новыя саставы кіруючых органаў раённай камсамольскай арганізацыі, дэлегаты на XXX гарадскую справаздачна-выбарную камсамольскую канферэнцыю.

У састаў РК ЛКСМБ выбраны сакратар камітэта камсамола ГДУ **Алег Дземідзенка**, кандыдатамі ў члены РК ЛКСМБ — яго намеснікі **Алена Барсукова** і **Юрый Тарасенка**.

На арганізацыйным пленуме Цэнтральнага РК ЛКСМБ першым сакратаром раённага камітэта камсамола выбраны **Іван Бордак**, другім сакратаром — **Ігар Караткевіч**, сакратаром — **Надзежда Падзорава**. У састаў бюро РК ЛКСМБ выбраны **Алег Дземідзенка**.

У рабоце XXIV камсамольскай канферэнцыі ўдзельнічалі сакратар гаркома КПБ **Н. Ф. Іванова**, першы сакратар Цэнтральнага РК КПБ **Г. М. Кускова**, другі сакратар РК КПБ **Л. Д. Рыжкова**, сакратар раённага камітэта партыі **Ю. Г. Грыцэвіч**, старшыня райвыканкома **М. У. Краўцоў**, інструктар ЦК ЛКСМБ **В. А. Дзенчык**, загадчык сектара Цэнтральнага савета Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна **А. М. Паноў**, першы сакратар гаркома ЛКСМБ **В. А. Асіпенка**.

* * *

27-га снежня ў Доме палітасветы абкома КПБ адбылася XXX гарадская справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя. Са справаздачай гаркома ЛКСМБ выступіў яго першы сакратар **Вячаслаў Асіпенка**.

На канферэнцыі, на якой наш універсітэт быў прадстаўлены 26 дэлегатамі, выбраны новыя саставы кіруючых органаў гарадской камсамольскай арганізацыі, дэлегаты на XXV абласную камсамольскую канферэнцыю.

Сакратар камітэта ЛКСМБ нашага універсітэта **Алег Дземідзенка** і сакратар камітэта камсамола матэматычнага факультэта **Эла Савянок** выбраны членамі, а **Алена Барсукова**, намеснік сакратара камітэта камсамола ГДУ — кандыдатам у члены ГК ЛКСМБ. Трэцякурсніца эканамічнага факультэта **Алена Балога** выбрана членам рэвізійнай камісіі гарадской камсамольскай арганізацыі.

На арганізацыйным пленуме першым сакратаром гаркома ЛКСМБ выбраны **Вячаслаў Асіпенка**, другім сакратаром — **Галіна Пашэд**, сакратаром — **Людміла Лісюк**.

Членам бюро ГК ЛКСМБ выбрана **Эла Савянок**.

У рабоце гарадской камсамольскай канферэнцыі прынялі ўдзел другі сакратар абкома КПБ **В. А. Санчукоўскі**, інструктар ЦК КПБ **М. М. Чэб**, першы сакратар Гомельскага гаркома КПБ **Ю. А. Самборскі**, старшыня гарвыканкома **А. Ц. Казлоўскі**, першыя сакратары раённых камітэтаў партыі, сакратары і члены бюро ГК КПБ, загадчык сектару друку ЦК ВЛКСМ **Ю. У. Піліпенка**, загадчык аддзела ЦК ЛКСМБ **І. І. Сцяпура**, першы сакратар Гомельскага абкома ЛКСМБ **У. К. Трацякоў**, намеснік рэдактара газеты «Чырвоная змена» **В. П. Шыханцоў**, ветэраны партыі і камсамола.

*З агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу*

## ДАРУЧЭННЕ—ПАКАЗЧЫК АКТЫЎНАСЦІ

26-га снежня ў актавай зале адбыўся агульнауніверсітэцкі партыйны сход. Па дакладу намесніка сакратара парткома асістэнта кафедры гісторыі КПСС **І. В. Нямкевіча** абмеркавана пытанне «Аб практыцы размеркавання партыйных і грамадскіх даручэнняў і арганізацыі кантролю за іх выкананнем».

У спрэчках на сходзе выступілі: старшыня камісіі парткома па кантролю адміністрацыі за якасцю вучэбна-метадычнай работы **У. І. Міроненка**, сакратар партбюро геалагічнага факультэта **Ж. А. Герасімава**, дырэктар філіяла універсітэта марксізму-ленінізму абкома КПБ дацэнт кафедры палітэканоміі **У. С. Дайнэка**, партгрупорг кафедры аналізу гаспадарчай дзейнасці **І. К. Кекіш**, старшыня прафкома студэнтаў **Н. І. Колтышава**, дэкан фізічнага факультэта **М. В. Максіменка**, старшыня галаўной групы народнага кантролю ГДУ, намеснік сакратара парткома **Ю. А. Пралярскоўскі**, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі, член парткома **І. Ф. Харламаў**, дэкан эканамічнага факультэта **У. Д. Арэшчанка**, інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў абкома КПБ **В. М. Коршакаў**.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

На партыйным сходзе заслуханы і прыняты да ведама інфармацыі: намесніка сакратара парткома **Г. Д. Ветлугаева** — «Аб ходзе выканання пастановы справаздачна-выбарнага партсходу ад 17 кастрычніка 1985 г.» і сакратара парткома **М. І. Старавойтава** — «Аб выкананні патрабаванняў інструкцыі ЦК КПСС «Аб членскіх узносах членаў і кандыдатаў у члены КПСС».

У камуніста няма іншай прывілеі, як быць толькі там, дзе даводзіцца цяжэй, уносіць максімальны ўклад у вырашэнне ўсіх задач, якія ставяць перад савецкім грамадствам партыя і ўрад. Гэтая думка акрэслена гучала на агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе як у дакладзе намесніка сакратара парткома І. В. Нямкевіча, так і ў выступленнях. Адным з важнейшых крытэрыяў актыўнасці кожнага камуніста з'яўляецца яго ўдзел у грамадскім жыцці, адносіны да выканання партыйных даручэнняў.

Несумненна, баяздольнасць любой партыйнай арганізацыі, зазначыў у дакладзе І. В. Нямкевіч, залежыць менавіта ад умення правільна размеркаваць сілы, выбіраць галоўныя напрамкі ў рабоце, прыводзіць у дзеянне творчы патэнцыял камуністаў. Ва універсітэце вядзецца пэўная работа па ўпарадкаванню размеркавання партыйных і грамадскіх даручэнняў. Аднак, аналіз становішча спраў у гэтым напрамку дзейнасці паказвае, што загружанасць даручэннямі ў партгрупах і на кафедрах далёкая ад рацыянальнай. Адны камуністы маюць іх шмат, іншыя ж — толькі адно або нават не маюць наогул. Нярэдка даручэнні размяркоўваюцца стыхійна, а для павышэння адказнасці некаторых камуністаў за іх выкананне недастаткова выкарыстоўваюцца справаздачы на партыйных сходах, пасяджэннях партбюро і індывідуальныя субяседванні. Не праяўляюцца належныя клопаты і патрабавальнасць да маладых камуністаў, у выніку чаго некаторыя з іх у перыяд праходжання кандыдацкага стажу груба парушалі статутныя патрабаванні. Ёсць таксама факты недысцыплінаванасці асобных камуністаў (парушэнне службовай дысцыпліны, несвоечасовая ўплата партыйных узносаў, дрэннае наведванне заняткаў у сістэме марксісцка-ленінскай адукацыі).

Для навядзення элементарнага парадку ў размеркаванні даручэнняў, сказаў дакладчык, неабходна дабіцца адзінага разумення таго, што ўваходзіць у такое па-рознаму трактуемае ў розных партгрупах кола партыйных і грамадскіх даручэнняў камуніста. Выкананне абавязкаў сакратара кафедры, адказнага за матэрыяльную частку, членства ў розных таварыствах, спецыялізаваных саветах, рэдкалегіях, чытанне лекцый перад насельніцтвам, кураторства ў групе не з'яўляюцца партыйным і грамадскім даручэннем. Іншая справа — работа на выбарных пасадах у грамадскіх арганізацыях і фарміраваннях. Неабходна ацэньваць грамадскую актыўнасць кожнага як мінімум па некалькіх асноўных параметрах: работа — на студэнта, работа — на кафедру, работа — на універсітэт, работа — на вышэйстаячыя арганізацыі.

«Асноўная партыйна-грамадская нагрузка чалавека, — адзначаў М. І. Калінін, — гэта яго вытворчая праца. Калі ў чалавека вытворчыя вынікі нездавальняючыя, а ўсе астатнія паказчыкі добрыя, я б сказаў, што ён дрэнны камуніст». А наша вытворчасць, зазначыў І. В. Нямкевіч, гэта — студэнт. Ва ўмовах перабудовы вышэйшай школы універсітэту, факультэтам, кафедрам, студэнцкаму самакіраванню, як ніколі раней, патрабуюцца ўвага, творчасць і сілы партыйнай арганізацыі. У нас жа нярэдка камуністы, занятыя гаспдагаворнай работай або дзейнасцю па даручэнню вышэйстаячых партыйных і грамадскіх арганізацый, зусім забываюць дарогу і ў дэканаты, і ў інтэрнаты, і на камсамольскія сходы.

Нельга абыходзіць даручэннямі таксама нашых ветэранаў — камуністаў-пенсіянераў, многія з якіх працягваюць уносіць пасільны ўклад у справы партыйнай арганізацыі ГДУ.

Вельмі важны бок справы — кантроль за выкананнем даручэнняў. Навядзенне належнага парадку ў гэтым звязана з пэўнай псіхалагічнай перабудовай. Трэба рашуча пазбаўляцца ад «зон, закрытых для крытыкі» і «недатыкальнасці для крытыкі» асобных камуністаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

## З УЗНАГАРОДАЙ!

**За плённую навукова-педагагічную дзейнасць, актыўную грамадскую работу і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры фізічнай метралогіі АНТРОПАЎ Уладзіслаў Андрэевіч узнагароджаны Ганаровай граматай рэктарата, парткома і прафкома універсітэта.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат геалагічнага факультэта, кафедра мінералогіі і агульнай геалогіі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры КАРАШКОВУ Людмілу Аляксандраўну з выпадку зацвярджэння яе ВАКам у вучонай ступені кандыдата геолага-мінералагічных навук.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, Савет кафедр грамадскіх навук горача віншуюць асістэнта кафедры палітычнай эканоміі ВАРОНІЧА Аляксандра Уладзіміравіча (навуковы кіраўнік — прафесар М. В. Навучыцель) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.**

# ДАРУЧЭННЕ — ПАКАЗЧЫК АКТЫЎНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Партыйны сход прыняў разгорнутую пастанову, якая абавязвае партком, партбюро і пярвічныя партарганізацыі ўсямерна павышаць авангардную ролю камуністаў ГДУ. Запатрабавана дабівацца таго, каб яны былі сапраўднымі палітычнымі байцамі і арганізатарамі, вызначаліся творчай працай, адзінствам слова і справы, ініцыятывай, патрабавальнасцю да сябе і іншых, бескампраміснa змагаліся з недахопамі, коснасцю, лагоднасцю і самазаспакоенасцю. Прызнана неабходнай штогадовая якасная ацэнка выканання партыйных і грамадскіх даручэнняў камуністамі, субяседаванні з членамі КПСС па пытаннях іх асабістага ўдзелу ў перабудове вышэйшай школы. Вырашана ўзяць пад кантроль размеркаванне сярод выкладчыкаў-грамадазнаўцаў даручэнняў раённых, гарадскіх і абласных партыйных і грамадскіх арганізацый.

Няўхільна ажыццяўляючы ленінскае патрабаванне аб умацаванні аўтарытэта партыі, чысціні яе радоў, будзе павышана патрабавальнасць да ўступаючых у рады КПСС. Кандыдацкі стаж яны будуць праходзіць так, каб можна было ўсебакова праверыць дзелавыя, палітычныя і маральныя якасці кандыдатаў. Прадугледжана таксама строгае запытанне з камуністаў-кіраўнікоў за ўдзел беспартыйных членаў кіруемых імі калектываў у грамадскай рабоце ў адпаведнасці з патрабаваннямі да прафесарска-выкладчыцкага саставу.

*У арганізацыі таварыства «Веды»*

# ПЕРАБУДОВЕ — ІНІЦЫЯТЫВУ І ПОШУК

У рашэнні складаных і маштабных задач паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны рашаючае значэнне належыць перабудове ва ўсіх сферах эканамічнага і грамадскага жыцця. Стратэгічны курс партыі знаходзіць шырокую падтрымку і ўвасабленне ў канкрэтных справах савецкіх людзей.

Працэс перабудовы набірае сілу. І мы павінны чотка засвоіць, што гэты працэс залежыць ад кожнага з нас, ад нашых адносін да справы, ад того, кім мы будзем у нашым агульным доме — гаспадарамі ці пабочнымі назіральнікамі.

Галоўным напрамкам перабудовы, адзначалася на IV пленуме ЦК КПБ, з'яўляецца фарміраванне сучаснага мыслення. Самае складанае ў гэтай справе — перабудаваць псіхалогію людзей, дапамагчы ім пазбавіцца старых поглядаў, зразумець: тое, што было добра 20—40 гадоў таму назад, на сённяшні дзень ужо не павінна задавальняць.

Адносіны да перабудовы, адзначалася ў выступленні першага сакратара ЦК КПБ М. М. Слюнькова на сустрэчы з выбаршчыкамі, не аднатначныя. Большасць, усвядоміўшы яе неабходнасць, дзейнічаюць энергічна, настойліва, шукаюць шляхі паляпшэння справы. Але ёсць і іншыя — прыхільнікі тактыкі чакання. Яны разважаюць так: калі перабудова працэс доўгі, то і спяшацца не варта.

Працэс перабудовы патрабуе ад нас ломкі старых стэрэатыпаў мыслення і дзеянняў, звычак і ў лекцыйнай прапагандзе. Ён прадугледжвае развіццё ініцыятывы пярвічных арганізацый, пошук нестандартных падыходаў да лекцыйнага матэрыялу, павышэнне асабістай адказнасці за яго якасць, выхаванне дысцыплінаванасці і самадысцыпліны ў першую чаргу. Не будзем, як кажуць, далёка хадзіць за прыкладамі. Закончыўся год, падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва і ў галіне лекцыйнай прапаганды, намячаюцца планы на будучае. Аднак, старшыні пярвічных арганізацый таварыства «Веды» фізічнага факультэта Г. Ю. Цюмянкоў, факультэта фізічнага выхавання А. Ф. Сямікоп, кафедры філасофіі А. А. Фяськоў, гісторыка-філалагічнага факультэта У. С. Дайнэка своечасова не падвялі вынікі і не прадставілі справаздачы ў партком. Якую ж ацэнку можна даць такой рабоце?

Мы шмат гаворым і аб неабходнасці рэцэнзавання лекцый, іх праслухоўвання і напісання водзываў, як састаўной часткі работы па перабудове. Аднак усё застаецца без перамен. У большасці пярвічных арганізацый аднесліся да гэтага фармальна, рэцэнзавання і праслухоўвання можна лічыць не было. І толькі лектары кафедр палітэканоміі, педагогікі і псіхалогіі з належнай сур'ёзнасцю падышлі да гэтага пытання. Станоўчыя рэцэнзіі былі прадстаўлены на лекцыі А. А. Лытко, У. В. Зарэцкага, Г. Д. Ветлугаева, У. Ф. Бондарава і інш.

Даўно не праводзілася рэцэнзаванне лекцый лектараў па навукова-тэхнічнай і прыродазнаўча-навуковай тэматыцы, прапагандзе здаровага ладу жыцця, літаратуры і мастацтву. Партыйным бюро і старшыням пярвічных арганізацый таварыства «Веды» фізічнага, матэматычнага, біялагічнага, геалагічнага, гісторыка-філалагічнага факультэтаў і факультэта фізвыхавання трэба ўдзяліць гэтаму пытанню належную ўвагу, разгледзець лекцыйна-прапагандысцкую дзейнасць камуністаў на пасяджэннях бюро або партсходах. Некалькі самаўхіліліся ад лекцыйнай работы ў працоўных калектывах раёна і лектары эканамічнага факультэта (старшыня Т. Д. Трацэўская, сакратар партбюро Т. В. Карпей). Ёсць тут складанасці і з цыклавымі пытаннямі, выездамі ў раёны. Гэтыя пытанні патрабуюць вырашэння ў бліжэйшы час.

На пленуме ЦК КПБ адзначаліся марудныя тэмпы перабудовы ў рэспубліцы, нізкая актыўнасць камуністаў. Гэта характэрна і для камуністаў-лектараў нашай арганізацыі. У той час, як большасць членаў КПСС правільна ўсвядомілі сваё месца ў перабудове лекцыйнай работы, займаюць актыўную жыццёвую пазіцыю, чытаюць больш 70 лекцый у год па актуальнай тэматыцы, ёсць і такія, якія забываюць аб сваім прызначэнні — быць праваднікамі рашэнняў партыі і ўрада на ўсіх участках работы. Гэта Ю. Ф. Пархоменка, В. М. Лебедзева, З. М. Сямейных, М. П. Савінская, А. А. Цітова, А. Ф. Рогалеў, Ф. М. Семяненка, А. Г. Грышачкін, Г. М. Коўзік, М. В. Акуліч, А. В. Бычэнка, І. П. Арабіна, В. П. Рубанік, В. Е. Быхаўцаў і інш.

Праўленню таварыства «Веды» і парткому ГДУ трэба вырашыць таксама пытанне аб стварэнні метадычнага кабінета лекцыйнай работы і далейшым ажыццяўленні пастановы Калегіі Мінвуза БССР і Прэзідыума таварыства «Веды» БССР «Аб актывізацыі ўдзелу ў лекцыйна-прапагандысцкай рабоце выкладчыкаў ВНУ рэспублікі». Ва універсітэце неабходна мець сваю літаратуру па праблемах лекцыйнай прапаганды. Аднак сабраць яе пакуль што няма магчымасці з-за адсутнасці памяшкання. Рашэнне гэтага пытання абмяжоўваецца толькі абяцаннямі.

Не перашкаджаць рабоце лектараў, а заахвочваць іх ініцыятыву — вось да чаго трэба імкнуцца нашай партарганізацыі.

Толькі агульнымі намаганнямі пярвічных арганізацый таварыства «Веды», партбюро факультэтаў, саміх лектараў мы можам паспяхова правесці перабудову лекцыйна-прапагандысцкай работы нашай арганізацыі, шырэй укараняць нетрадыцыйныя формы работы, праціўгваць пошук новых, развіваць творчую ініцыятыву мас.

**В. СТАРАКОЖАВА,**
**адказны сакратар таварыства «Веды» ГДУ.**

# СТВОРАН ЖАНСАВЕТ

Жансаветы, якія ствараюцца цяпер у працоўных калектывах краіны, яшчэ адна форма дэмакратызацыі нашага жыцця. Яны карыстаюцца ўсімі правамі, якія дадзены грамадскім арганізацыям. Работа жаночых саветаў — гэта жывая справа, якая патрабуе творчага падыходу.

На сходзе калектыву універсітэта нядаўна быў выбраны жансавет ГДУ. У яго ўвайшлі выкладчыцы кафедр, супрацоўніцы розных структурных падраздзяленняў. На арганізацыйным пасяджэнні старшынёй жансавета абрана дацэнт кафедры гісторыі КПСС Т. І. Язэпава, намеснікам старшыні — загадчыца кафедры англійскай мовы, кандыдат педагагічных навук Л. С. Баннікава.

Шырокае кола пытанняў будзе вырашаць жансавет: вытворчыя, культурна-масавыя, сямейна-бытавыя і інш.

У г. Гомелі створан абласны савет жанчын. На арганізацыйным пасяджэнні прэзідыума абласнога савета жанчын Л. С. Баннікава выбрана яго сакратаром.

**(Наш кар.).**

## *МЫ—ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ*

**7-ГА СТУДЗЕНЯ — ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ КАМПУЧЫІ**

# З ВЕРАЙ У БУДУЧЫНЮ

Народная Рэспубліка Кампучыя — дзяржава ў паўднёва-ўсходняй частцы паўвострава Індакітай. Тэрыторыя яе — 181 тыс. кв. км, насельніцтва — звыш 7,5 млн. чалавек. Асноўнае насельніцтва маёй радзімы — кхмеры (90%), тут пражываюць таксама в'етнамцы, кітайцы, таі, меа і інш. У сталіцы — Пнампені — каля 700 тыс. жыхароў.

Кампучыя — адна са старажытных дзяржаў Індакітая. З 1863 г. яна была пратэктаратам Францыі. У час другой сусветнай вайны краіну акупіравалі японскія захопнікі. У 1945 годзе, пасля паражэння Японіі, Кампучыю зноў захапілі французскія каланізатары. Патрыятычныя сілы краіны вялі барацьбу за свабоду і незалежнасць, і ў 1954 годзе Францыя была вымушана прызнаць суверэнітэт і незалежнасць Кампучыі. У сакавіку 1970 года ў Кампучыі адбыўся дзяржаўны пераварот, у выніку якога да ўлады прыйшла група ваенных і правых дзеячаў. У маі таго ж года былі створаны нацыянальны адзіны фронт Кампучыі, які ўзначаліў барацьбу супраць праамерыканскага рэжыму на чале з Лон Нолам.

У красавіку 1975 года гераічная барацьба кампучыйскага народа завяршылася перамогай. Са студзеня 1976 года краіна стала называцца Дэмакратычнай Кампучыяй. Аднак уладу ў краіне захапіла рэакцыйная кліка Пол Пота — Іенг Сары, якая здрадзіла інтарэсам народа і ўстанавіла жорсткі дыктатарскі рэжым. Уся краіна была ператворана ў вялізны канцэнтрацыйны лагер. Амаль за чатыры гады ў выніку тэрора, голаду і эпідэміі загінула больш трох мільёнаў кампучыйцаў. Былі фізічна знішчаны кваліфікаваныя кадры, амаль уся інтэлігенцыя, ліквідаваны сістэмы аховы здароўя і асветы. Я і мае сябры — кампучыйскія студэнты ГДУ — добра памятаем гэты жудасны час, і мы цвёрда ўпэўнены ў светлым будучым нашай радзімы.

У снежні 1978 года быў утвораны Адзіны фронт нацыянальнага выратавання Кампучыі, які ўзначаліў барацьбу супраць дыктатарскага рэжыму. У пачатку студзеня 1979 года рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы пры падтрымцы в'етнамскіх дабраахвотнікаў зверглі ненавісны палпотаўскі рэжым. Краіна была абвешчана Народнай Рэспублікай Кампучыяй. СССР, В'етнам, іншыя сацыялістычныя краіны, уся прагрэсіўная грамадскасць свету віталі перамогу рэвалюцыйных сіл Кампучыі.

Пасля перамогі народна-дэмакратычнай рэвалюцыі з'явіліся шырокія перспектывы для развіцця народнай асветы. Перад маладой рэспублікай паўстала задача стварыць фактычна на новым месцы новую сістэму асветы. Мэта гэтай сістэмы — выхоўваць чалавека будучага сацыялістычнага грамадства. Народна-рэвалюцыйная партыя Кампучыі, Генеральны сакратар ЦК НРПК таварыш Хенг Самрын ставяць задачу забяспечыць цеснае адзінства ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання моладзі.

Атрымаўшы адукацыю ў Савецкім Саюзе, мы будзем выкладаць рускую могу ў сябе на радзіме. Веданне гэтай мовы неабходна для нашага народа, які, узняўшыся з попелу, упэўнена крочыць у будучыню.

**Тхаўро РАТ**
**(Народная Рэспубліка Кампучыя),**
**студэнт I курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ШЧАСЦЕ САВЕЦКІХ ДЗЯЦЕЙ

Нядаўна мы, замежныя студэнты, наведалі адзін з дзіцячых садоў Гомеля. Гэты дзень нам вельмі запомніўся.

Нам паказалі пакоі, у якіх гуляюць, умываюцца, спяць дзеці. Уразіла чысціня і парадак у дзіцячым садзе. Вельмі спадабаліся нам малюнкі дзяцей аб міры, дружбе паміж народамі, аб сваім шчаслівым дзяцінстве. Гэта вельмі цудоўна, што савецкія дзеці, якія не бачылі вайны, так горача хочуць міра і шчасця для ўсіх дзяцей на свеце! Дзеці спявалі, танцавалі, расказвалі вершы аб міры і дружбе, і промні яркага зімовага сонца залівалі залу. І здавалася тады, што ў свеце няма войнаў, ахвяр, разбурэнняў.

У мінулым годзе, калі я вучыўся на падрыхтоўчым факультэце БДУ імя У. І. Леніна, таксама быў на экскурсіі ў дзіцячым садзе. Я маю падставу сказаць, што ў Савецкім Саюзе створаны самыя лепшыя ўмовы для дзяцей. Пры гэтым я не магу не параўнаць жыццё савецкіх дзяцей і дзяцей маёй радзімы. На жаль, у нас няма дзіцячых садоў, і таму дзеці ў нас выхоўваюцца дома. Вельмі цяжка тым дзецям, у якіх няма бацькоў: ім няма адкуль чакаць дапамогі.

Мы добра ведаем аб тым, што ў капіталістычным свеце дзеці без бацькоў (і нават з бацькамі) хварэюць і паміраюць. Нярэдка прычынай смерці з'яўляецца голад. Калі б ва ўсім свеце не траціліся мільёны долараў на ўзбраенне, то дзеці ўсяго свету былі б шчаслівымі. Грошы — не на ўзбраенне, а на выхаванне дзяцей!

**Дхамананда КАХАТАВІЛА**
**(Шры-Ланка),**
**студэнт 1 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Літаратурныя сустрэчы*

# ЧАЛАВЕК, З ЯКІМ ЦІКАВА

На гісторыка-філалагічным факультэце сталі традыцыйнымі і вельмі карыснымі сустрэчы студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў з вядомымі беларускімі празаікамі, паэтамі, драматургамі, літаратуразнаўцамі, вучонымі.

У канцы мінулага года госцем шматлікага калектыву гістфіла быў пісьменнік, доктар філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР Адам Іосіфавіч Мальдзіс. Шырокаму колу чытачоў ён вядомы як аўтар многіх кніг навуковага і мастацкага характару. Яго даследаванні «Традыцыі польскага асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя», «Таямніцы старажытных сховішчаў», «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.» вызначаюцца багаццем фактычнага матэрыялу, пакладзенага ў іх аснову, навуковым абгрунтаваннем высноў.

Аповесць А. Мальдзіса «Восень пасярод вясны» прываблівае цікавым сюжэтам. Галоўныя героі яе — вядомы рэвалюцыянер, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 г. Кастусь Каліноўскі, паэт Уладзіслаў Сыракомля, артыстка Галіна Маеўская, селянін Грыва. Яны ў складанай сітуацыі прымаюць рашэнні, якія істотна ўплываюць на іх далейшае жыццё.

З цікавасцю ўдзельнікамі сустрэчы былі праслуханы выступленні выкладчыкаў кафедр беларускай літаратуры і гісторыі СССР і БССР В. К. Шынкарэнка і В. І. Сычова, а таксама студэнта 4-га курса М. Шуканава, у якіх гаварылася аб плённай навуковай, пісьменніцкай і грамадскай дзейнасці А. І. Мальдзіса.

Госць падзяліўся сваімі творчымі планамі і задумамі, расказаў аб сваёй новай кнізе «З літаратуразнаўчых вандраванняў», якая хутка выходзіць у свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Жадаючыя набыць яе могуць аформіць папярэдні заказ у кнігарні № 19. Адам Іосіфавіч адказаў на пытанні, якія былі яму зададзены ўдзельнікамі сустрэчы. Аматары творчасці А. Мальдзіса маглі набыць на сустрэчы яго кнігі, атрымаць аўтографы аўтара.

**В. ЯЦУХНА,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

# ПАГЛЫБЛЯЮЦЬ ВЕДЫ

На 4 курсе фізічнага факультэта праведзена выніковая канферэнцыя па курсу «Палітычная эканомія». Яна была прысвечана паглыбленаму вывучэнню стратэгіі паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Тэматыка паведамленняў распрацоўвалася з улікам высвятлення новых якасных прынцыпаў росту эканомікі і павышэння яе эфектыўнасці.

Высвятленню асаблівасцей XII пяцігодкі, ходу выканання заданняў яе першага года прысвяціў сваё выступленне студэнт гр. Ф-46 У. Позаў. Змест і галоўныя напрамкі паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны знайшлі адлюстраванне ў выступленні А. Васільевай (Ф-44). Яе аднакурсніца Л. Хрычкова гаварыла аб галоўнай крыніцы эканамічнага росту — інтэнсіфікацыі грамадскай вытворчасці. Поўную характарыстыку цэнтральнага звяна інтэнсіфікацыі эканомікі — павышэнню прадукцыйнасці грамадскай працы — дала ў сваім выступленні В. Прычка (Ф-46). Асноўным фактарам, якія забяспечваюць рэалізацыю курса партыі на кардынальнае паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, прысвяціла сваё выступленне М. Пынько (Ф-41). Актуальна прагучала і паведамленне А. Іўліева (Ф-42) аб некаторых аспектах фальсіфікацыі антыкамуністамі стратэгіі паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР.

Вынікі канферэнцыі падвёў дацэнт Г. Д. Ветлугаеў.

Такія канферэнцыі на фізічным факультэце сталі традыцыйнымі і маюць вялікае значэнне для больш глыбокага засваення пытанняў практычнай рэалізацыі эканамічнай палітыкі партыі на сучасным этапе.

**В. СІНІЦКІ,**
**студэнт гр. Ф-42**
**фізічнага факультэта.**

*У народным універсітэце маральна-эстэтычнага выхавання*

# ШЧАСЛІВЫ ЯГО ЛЁС...

У памяшканні студэнцкага кафэ паўзмрок. Толькі слабае мігценне свечак асвятляе фігуру чытальніцы Ларысы Сініла, студэнткі матэматычнага факультэта, члена клуба «Градыент» народнага ўніверсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. Перад гледачамі ярка і маляўніча аформлены Аляксандрай Бур'як альбом, старонкі якога адлюстроўваюць важныя вехі развіцця раманса. Гучыць «Раманс аб рамансе» з кінафільма «Жорсткі раманс».

Глядзіш на твары прысутных і думаеш: якая вялікая ўлада музыкі над душамі людзей, якія прыйшлі на сустрэчу з рамансам, гістарычны лёс якога аказаўся надзвычай шчаслівым, бо як мы даведваемся, перажыў ён і безразважную хвалу, бяздумную ганьбу, ім упіваліся да самазабыцця, яго праследавалі як бескультурны перажытак мінулага, збывалі мяшчанам, заваёўвалі для «высокага» мастацтва, зноў адмянялі, каб затым зноў уваскрасіць, хоць ён і не думаў паміраць. Сапраўды, як пісала Святлана Кузняцова:

**Жестокий романс, я смеюсь над тобой**
**За то, что красив ты и светел,**
**За то, что на все, что случится с судьбой,**
**Ты просто и ясно ответил.**
**За то, что умна твоя старая грусть**
**И я перед нею немею.**
**За то, что я знаю тебя наизусть**
**И лучше сказать не умею.**

Вядучая Ларыса Сініла адкрывае першую старонку альбома. Так, радзіма раманса — Іспанія. Тут у XII—XIV ст. ст. у творчасці вандроўных музыкантаў, паэтаў і спевакоў зарадзіўся новы песенны жанр, які ўвасобіў у сабе прыёмы рэчытатыву, меладычных напеваў і мімічнага танца. А ў XVIII ст. у рускай музыцы раманс сімвалізуе адну з выдатнейшых старонак класічнага мастацтва.

У выкананні Наталлі Сініла прагучаў усхваляваны раманс Глінкі «Я тут, Інязілля». Як бачым, гукавое багацце паэзіі А. С. Пушкіна было крыніцай высокага натхнення для многіх пакаленняў рускіх і савецкіх кампазітараў. Раманс праілюстраваў абвострана-чулыя адносіны вялікага кампазітара да паэтычнага слова, тонкіх нюансаў аўтарскай інтанацыі. Менавіта жывое пачуццё, глыбокая думка, шчырае перажыванне, высокія страсці нараджаюць вобразнае гучанне, ствараюць поўную цудадзейнай сілы і прывабнасці музыку.

Трэцяя старонка альбома расказала аб тым, як разам з удасканальваннем рускай паэзіі развіваўся і рускі раманс, гэтая вельмі шчырая лірыка, якая ідзе ад сэрца і народжана імкненнем выказаць самыя глыбокія і асабіста інтымныя перажыванні.

Раманс «Я помню цудоўнае імгненне» у прафесійным выкананні Наталлі Сініла сведчыць аб здзіўляючай прастаце, свежасці і непасрэднасці раманса, які дарэчы, нагадаў нам паэтычную старонку з біяграфіі вялікіх людзей — паэта А. С. Пушкіна і кампазітара М. Глінкі. Калі Пушкін прысвяціў свой натхнёны верш Ганне Пятроўне Керн, то Глінка ў музыцы не менш геніяльна выразіў свае пачуцці да яе дачкі Кацярыны.

Удзельнікі літаратурна-музычнай кампазіцыі пазнаёмілі нас з цудоўнымі класічнымі рамансамі, творцамі якіх з'яўляліся такія майстры айчыннага музычнага мастацтва, як Даргамыжскі, Барадзін, Мусаргскі, Балакіраў, Рымскі-Корсакаў, Кюі, Чайкоўскі, Рахманінаў. Асабліва ўсхваляваў нас раманс Чайкоўскага «Не, толькі той, хто ведаў». Выканаўца здолела перадаць складаны стан чалавечай душы, а інакш і нельга, бо адна з асаблівасцей раманса — быць заўсёды праўдзівым, несці ў сабе радасці і смутак.

Асабліва паэтычнай была восьмая старонка альбома-расказа пра раманс. Аказваецца, шматколернае паэтычнае слова самабытнай творчай натуры С. Ясеніна было надзвычай прыцягальным для кампазітараў сваёй даверлівай інтанацыяй, мяккасцю, цеплынёй. Раманс «Не шкадую, не заву, не плачу» у выкананні студэнта 1-га курса матэматычнага факультэта Андрэя Казлова і студэнткі 4 курса гэтага ж факультэта Галіны Сулейка пацвердзіў, наколькі моцная ў паэзіі С. Ясеніна гармонія пачуцця і слова, думкі і вобраза, наколькі непаўторнае песеннае ясенінскае слова.

Добрую і карысную справу робіць клуб «Градыент». Яго ўдзельнікамі праведзена шмат цікавых мерапрыемстваў як пазнавальнага, так і выхаваўчага характару, мерапрыемстваў захапляючых, калі студэнты наведваюць іх з вялікім жаданнем і радасцю, чакаюць іх правядзення з нецярплівасцю. Хочацца выказаць словы шчырай падзякі нястомным кіраўнікам клуба «Градыент» Наталлі Паўлаўне Капшай і Яніне Уладзіміраўне Аксюцік, адданым сваёй справе, а таксама членам клуба за цудоўныя хвіліны «сустрэчы» з рамансам і пажадаць ім ў новым 1987 годзе плёну іх творчаму натхненню.

**В. НОВАК,**
**супрацоўніца кафедры беларускай літаратуры.**

*На нарадзе маладых*

# СПАСЦІГАЦЬ ЧАС

Нядаўна ў маім жыцці адбылася падзея, уражанне ад якой — вельмі вялікае, а ўвогуле — супярэчлівае. Мне давялося прымаць удзел у штогадовай снежаньскай нарадзе маладых пісьменнікаў Беларусі. Хачу расказаць пра гэты невялікі адрэзак часу, на працягу якога прыйшлося пераасэнсаваць многія свае думкі і дзеянні. Гэтым адрэзкам сталі сем дзён знаходжання ў рэспубліканскім Доме творчасці «Іслач», што непадалёку ад Мінска, у Валожынскім раёне.

Дарэчы, нам, дваццаці пяці чалавекам, атрымаўшым запрашэнне, выпаў гонар быць першымі ўдзельнікамі работы новага Дома творчасці. Да гэтага часу нарады творчай моладзі рэспублікі праводзіліся ў Каралішчавічах, месцы, звязаным з жыццём Якуба Коласа.

«Іслач» — цудоўная мясціна для працы і адпачынку. Прыгожы дом, утульныя пакоі, актавая зала, сталовая, столікі з шахматамі, зала з камінам, дзе доўга не сціхалі спрэчкі, — кожнаму ўсё гэта прыйшлося да спадобы. Непадалёку ад Дома творчасці цячэ абрывістая Іслач. Быццам здані, у вячэрнім змроку высяцца гонкія сосны.

Мая памяць яшчэ і дагэтуль падсвядома жыве мінулым. Сем дзён — як адно імгненне. Сем дзён — і няма ніводнай вольнай мінуты. Напружанасць думкі і чаканне важнай размовы, вынікаў. Узрушанасць. Асэнсаванне пачутага. Такія пачуцці, напэўна, былі не толькі ў мяне.

Семінар пачаўся гутаркай пра развіццё літаратуры, культуры Беларусі. На ім прысутнічалі выдатныя беларускія паэты і празаікі: М. Танк, Н. Гілевіч, С. Законнікаў, В. Казько, В. Зуёнак, У. Някляеў, госці з Эстоніі: Эва Конт — студэнтка факультэта журналістыкі Тартускага ўніверсітэта, Ава Юпрус — малады крытык, а таксама госці з Масквы і Ленінграда.

Ніл Гілевіч звярнуўся да нас з наступнымі словамі: «Зараз у нашым жыцці склалася такая атмасфера, якая спрыяе творчаму росту. Але, разам з тым, на вас кладзецца адказнасць за развіццё нашай культуры. Час — вельмі адказны. Мы надаем самае сур'ёзнае значэнне такім нарадам, як гэта. Многае ў нас рабілася раней не так. І цяпер трэба гаварыць аб ўсім гэтым на поўны голас. Чым больш будзе грамадзянскай актыўнасці, тым лепш будзе для літаратуры. Можна дабіцца значных змен, калі выкрываць у хлусні любога... Маладому літаратару, які марыць аб сваім творчым шчасці, трэба перажыць тое, што перажывае народ. Як часта ў творчасці сучасных пісьменнікаў не відаць умення думаць і спасцігаць свой час».

На семінары былі закрануты і такія праблемы, як нізкі тэхнічны ўзровень паліграфічнай базы выдавецтваў, вялікія чэргі на выданне новых кніг, цяжкасці з выпускам малатыражнай літаратуры.

У ходзе выступлення пісьменнікаў Сяргею Законнікаву задалі пытанне: — Чаму ў апошні час не з'явілася ніводнай кнігі, якая б стала падзеяй? — Ва ўсе часы літаратура з адных геніяў не складалася, — адказаў ён. — Кожны пісьменнік, які ўносіць нешта новае, варты таго, каб друкавацца. Іншая справа — тое, што ў апошні час, чытаючы кнігі, заўважаеш, што ў іх мала болю. Усё гэта не так проста. Мы не навучыліся працаваць так, як трэба. Не крыўдзіцеся, калі да вас будуць вельмі сур'ёзныя патрабаванні. Трэба вучыцца. Без самаадукацыі ў літаратуры рабіць няма чаго.

Праграма семінара была вельмі змястоўнай. Кожны дзень працавалі секцыі паэзіі і прозы, на якіх абмяркоўваліся творы маладых пісьменнікаў. Сектар паэзіі ўзначальваў Рыгор Барадулін, у рабоце сектара прозы прынялі ўдзел рэдактар аддзела прозы часопіса «Маладосць» У. Дамашэвіч, крытык Я. Лецка, пісьменнік з Ленінграда А. Ляонаў.

На семінары адкрыты новыя імёны ў літаратуры: Андрэй Федарэнка, Сяргей Тарасаў, Уладзімір Сцяпан, Сымон Свістуновіч, Таццяна Дашкевіч. Па словах Рыгора Барадуліна, галоўным нервам семінара сталі вершы Вольгі Куртаніч, студэнткі 6-га курса завочнага факультэта ГДУ.

Адбыліся сустрэчы з вядучымі маладымі мастакамі Беларусі: Феліксам Янушкевічам, Віктарам Альшэўскім, Рыгорам Сітніцай, Вячаславам Паўлаўцом, з паэтэсай Яўгеніяй Янішчыц, крытыкам Паўлам Дзюбайлам, перакладчыкамі Карласам Шэрманам, Васілём Сёмухай.

З хваляваннем сустрэлі мы народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Найбольш запомніліся яго словы: «Для таго, каб стварыць нешта вартае, трэба мець высокую культуру».

Кульмінацыяй нарады, на мой погляд, стала сустрэча маладых пісьменнікаў з загадчыкам аддзела культуры ЦК КПБ І. І. Антановічам. З болем гаварылася аб тым, што ў рэспубліцы склалася надзвычай дрэннае становішча з духоўным здабыткам беларускага народа — мовай. Без роднай мовы не можа існаваць і развівацца далей яго культура. «Духоўнае мы крыху даём публіцыстыкай, — адзначыў І. І. Антановіч. — Прыйдзіце да нас з духоўнай праграмай, загаварыце аб сённяшнім дні»... — звярнуўся ён да ўдзельнікаў семінара.

Гарачай была размова з маладымі кампазітарамі рэспублікі Алай Барзовай, Ларысай Мурашка, Васілём Кандрасюком, Уладзімірам Солтанам. Мы праслухалі запісы іх твораў. Не ўсё пачутае нам спадабалася. Былі выказаны сур'ёзныя нараканні на тое, што цяпер вельмі мала ў нас добрых песень з беларускім тэкстам. Зрэшты, маладыя кампазітары і паэты пагадзіліся на тым, што неабходны больш цесны іх саюз у стварэнні сапраўды добрай музыкі, песень. Пры гэтай размове прысутнічала пісьменніца Клаўдзія Каліна. Своеасаблівым стаў яе ўдзел у спрэчцы: яна праспявала беларускія народныя песні, якія ўзніклі яшчэ 300—400 гадоў таму назад. Можна ўявіць сабе, якое ўражанне засталося ад пачутага!..

На закрыцці семінара першы сакратар Саюза пісьменнікаў БССР Н. Гілевіч сказаў: «...зразумеў, што ўсе 25 чалавек настроены патрыятычна да нашага галоўнага пытання. Час усклаў на нас нялёгкі абавязак. Сёння вас 25. Трэба, каб заўтра вас было 25 тысяч!.. Пасля гэтай сустрэчы вам не будзе лягчэй думацца. Калі думкі будуць цяжэй ісці — будзе лепш».

**Л. РАМАНАВА,**
**студэнтка 1-га курса гістфіла, удзельніца нарады.**

# Прыгажосць чалавека ў мастацтве

(ДА 600-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ІТАЛЬЯНСКАГА СКУЛЬПТАРА ДАНАТЭЛА).

**«О дивное и возвышенное назначение человека, которому дано достигнуть того, к чему он стремится, и быть тем, чем он хочет!»**
**(Джованни Пико делла Мирандола).**

Ва ўсе часы вобраз чалавека быў цэнтральнай тэмай мастацтва. Менавіта ў ім больш поўна і глыбока раскрываліся этычныя і эстэтычныя ідэалы кожнай эпохі. Італьянскае мастацтва эпохі Адраджэння аб'яднала запаветы антычнасці і лепшыя дасягненні сярэдневякоўя, дзякуючы чаму ў ім перамог чалавек, усведамляючы сябе вянцом Сусвету. Шуканні і ідэалы многіх майстроў зліліся ў вобраз новай ярка індывідуальнай асобы са сваім непаўторным фізічным абліччам, духоўным складам і тэмпераментам. Новае, рэалістычнае мастацтва, вызваляючыся ад рэлігійных абмежаванняў, імкнулася ўславіць жыццё і зацвердзіць магутнасць і годнасць чалавека, які ўпершыню ўсвядоміў сілу свайго розуму і творчых парыванняў.

У пачатку XV ст. у Італіі скульптура была вядучым мастацтвам. Пластыка валодала некаторай перавагай у параўнанні з жывапісам. У ёй праблемы новага мастацтва маглі вырашацца з асаблівай нагляднасцю. Статуя была круглай, яна займала сваё пэўнае месца ў прасторы, яе можна было памясціць на плошчы, што пашырала дыяпазон яе грамадскага ўздзеяння.

Сапраўдным рэфарматарам італьянскай скульптуры быў фларэнціец Данатэла (каля 1386—1446 г. г., поўнае імя Даната дзі Нікала Бета Бардзі). Гэта была моцная, рашучая натура, характар чыста мужчынскага складу, які не баяўся ламаць традыцыю, калі ў яго вачах яна сябе зжыла.

Ён быў сынам рамесніка, часальшчыка шэрсці. Першае навучанне прайшоў у майстэрнях пры фларэнційскім саборы. На яго станаўленне аказаў уплыў буйнейшы італьянскі архітэктар Філіпа Брунелескі, вялікае значэнне мела работа ў майстэрні вядомага скульптара Гіберці. Хутка сфарміраваўшыся як мастак, у 20 гадоў Данатэла пачаў працаваць самастойна.

Данатэла прайшоў складаны творчы шлях, заслужыў вялікую славу пры жыцці. Створаныя ім вобразы з'яўляюцца першым увасабленнем гуманістычнага ідэала ўсебакова развітай асобы. Яны адзначаны пячаткай яркай індывідуальнасці і духоўнага багацця. Яго самабытны талент праявіўся ў скульптурах, якія ўпрыгожваюць царкву Ор-Сан-Мікеле ў Фларэнцыі, адной з якіх з'яўляецца статуя св. Георгія. Гэты вобраз — увасабленне ў скульптуры чалавека-барацьбіта, чалавека непахіснай волі, які ўжо не ўяўляе сябе сляпой зброяй божага помыслу, а сам — уладар свайго лёсу. Яго вобраз, поўны страснага ўнутранага напружання, з'яўляецца жывым увасабленнем той эпохі, якая, па словах Ф. Энгельса, «нуждалась в титанах и которая породила титанов по силе мысли, страсти и характеру...»

Творчасць Данатэла здзіўляе разнастайнасцю новых пачынанняў. Ён адрадзіў адлюстраванне голага цела (статуя Давіда), паклаў пачатак скульптурнаму партрэту (фларэнціец Джавані Керыкіні ў вобразе прарока Авакума), адліў першы бронзавы помнік (кандацьер Гатамелата), стварыў новы тып надмагільнага помніка (папы Іаана XXIII), спрабаваў рашыць задачу свабодна стаячай скульптуры (Юдзіф і Алаферн).

Мастацтва Данатэла сучаснае: прыгажосць, фізічная і духоўная гармонія, грамадзянскасць і гуманізм з'яўляюцца рысамі дасканалай асобы. Творчасць Данатэла прыцягвае аптымістычнасцю і верай у бязмежныя магчымасці чалавека.

**Л. ЗАРУБЕНКА,**
**І. МІНКОВА,**
**студэнткі 3-га курса аддзялення гісторыі завочнага факультэта.**



У ЗІМОВЫМ ПАРКУ.

Фота А. Рудчанкі.

Віктар ЯРАЦ.

## СВЯТЛО СНЕГАПАДУ

Снег пайшоў бясшумна, нечакана.
Позні вечар свеціць чысцінёй.
Неба — нібы ціхае прызнанне,
неба — нібы споведзь над зямлёй.
Спавядацца хочацца і сэрцу
перад гэтай песняю нябёс,
верыць у людзей, нібы
ў бяссмерце,
верыць у людзей, нібы ў свой лёс.
Разам з небам, з небам у абдымку
на зямлі, дзе сцежкі замяло,
кожную крылатую сняжынку
дзякую за дзіўнае святло.
Слухаю дыханне зор схаваных
і зярнят, што сняць пра майскі
дзень.

Дзякуй, снег, што гэтак нечакана
прыгадаў харошых мне людзей,
прыгадаў далёкія сустрэчы,
вуліцы, што некуды плылі
караблямі праз агні і вечар,
нібы й не было самой зямлі...
Не знямелы свет і не аглухлы,
і надзей пялёсткамі святло
расцвіло над садам і над лугам,
і над сэрцам белым веццем
расцвіло.

# ТВОРЦА — КОЖНЫ З НАС

Усе мы весела сустрэлі адно з самых цудоўных свят — Новы год. Сёлета ў многіх з нас кватэры ўпрыгожвалі не традыцыйныя лясныя госці-прыгажуні-ёлкі, а невялікія навагоднія кампазіцыі, букеты. Іх напярэдадні сустрэчы Новага года мы змаглі ўбачыць на выстаўцы-конкурсе навагодніх кампазіцый, якую падрыхтавалі студэнты біялагічнага факультэта. Азнаёміўшыся з тым, што было на конкурсе прадстаўлена, мы нібыта пабывалі ў дзіўнай краіне фантазіі і майстэрства. Наведвальнікі выстаўкі змаглі пераканацца: усё гэта зрабіць не вельмі складана самім, у сябе дома. Вось і праявілі сваю выдумку, паспрабавалі свае здольнасці ў стварэнні цудоўнага, як зрабілі гэта, напрыклад, у сваіх кампазіцыях студэнты біяфака. Зіхацяць у зеляніне пушыстых галінак сасны рознакаляровыя шары. Цудоўна спалучаюцца з галінкамі хвоі аранжавыя ліхтарыкі фізаліса. Усё па-свойму цудоўнае і арыгінальнае.

Шмат творчасці і вынаходніцтва праявілі студэнты-біёлагі пры падрыхтоўцы конкурсу. Гэта ж вельмі важна не толькі ўмець заўважаць прыгажосць кветкі, прыроднага пейзажу, трэба вучыцца пранікаць у тварэнне прыроды. А прырода — вялікая багатая майстэрня для творчасці. Але трэба заўсёды памятаць: прыроду, якая нас так шчодра адорвае, трэба берагчы!

*КУТОК ФІЛАТЭЛІСТА*

# ПРАВАКАТАРЫ З ПАШТОВАГА ВЕДАМСТВА

«Філатэлія — інтэрнацыянальнае хобі» — так называецца нядаўні выпуск марак паштовай адміністрацыі ААН. Сапраўды, захапленне мільёнаў людзей на ўсіх кантынентах, можа актыўна служыць умацаванню ўзаемаразумення і даверу паміж народамі. Іншага пункту гледжання прытрымліваюцца, аднак, у некаторых капіталістычных дзяржавах.

Ужо некалькі дзесяцігоддзяў выкарыстоўвае паштовыя маркі ў інтарэсах прапаганды рэваншызму і псіхалагічнай вайны Міністэрства пошт і тэлеграфа ФРГ. Сярод падрыхтаваных чыноўнікамі пошты ФРГ «падарункаў» калекцыянерам — правакацыйныя выпускі, прысвечаныя падзеям 17 чэрвеня 1953 года — спробам контррэвалюцыйнага путча ў ГДР, адлюстраванне помнікаў польскіх і савецкіх гарадоў у серыі марак «Гістарычныя будынкі Федэратыўнай Рэспублікі». Вельмі «своеасабліва» паштовая адміністрацыя ФРГ адзначыла 40-годдзе разгрому гітлерызму. У гэты год была выдадзена марка, прысвечаная юбілею Бундэсвера, арганізоўваліся спецыяльныя гашэнні, якія адлюстроўвалі «адзінства ўзброеных сіл з народам». У маі 1985 года, напярэдадні Дня Перамогі, Міністэрства пошт і тэлеграфа ФРГ выпусціла чарговую марку ў гонар «вечна ўчарашніх» — членаў разнашэрсных арганізацый і групіровак, аб'яднаных пад дахам славутага «Саюза выгнаных». Праз сорак гадоў пасля разгрому гітлераўскага рэйха і вызвалення народаў Еўропы ад фашызму заходнегерманскія рэваншысты, не жадаючы зрабіць урокі з гісторыі, лічаць частку тэрыторыі Польшчы, Чэхаславакіі, іншых краін «сваімі», нахабна патрабуючы іх «вяртання», заяўляюць, што «вялікагерманскі рэйх юрыдычна працягвае існаваць у межах 1937 года».

Правакацыйная дзейнасць паштовага ведамства ФРГ працягваецца, аб чым сведчыць новы выпуск серыі «Гістарычныя будынкі Федэратыўнай Рэспублікі». Гэты выпуск адкрывае марка... «Будынак рэйхстага ў Берліне». Немагчыма ўявіць, што міністр пошт і тэлеграфа ФРГ К. Шварц-Шылінг, які прэзентаваў новы выпуск свайму таварышу па партыі ХСС старшыні бундэстага Ф. Енінгеру, не ведае, што Заходні Берлін, дзе размешчан будынак былога рэйхстага, які завецца на марцы па «традыцыі» проста Берлінам, тэрытарыяльна і юрыдычна ніякіх адносін да Федэратыўнай Рэспублікі не мае.

«Візітнай карткай краіны» назваў паштовую марку Г. Дзімітраў. У руках правакатараў з паштовага ведамства ФРГ яна становіцца візітнай карткай палітыкі правакацый і рэваншызму.

**І. НЯМКЕВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук, асістэнт кафедры гісторыі КПСС.**

**СПОРТ**

# АПЯРЭДЗІЎ МАЛОДШЫ БРАТ

У канцы снежня ў сталіцы нашай рэспублікі — Мінску завяршыліся рэспубліканскія спаборніцтвы па сучаснаму пяцібор'ю. Сярод мужчын барацьба за першынство разгарнулася паміж гамяльчанамі студэнтам-завочнікам ГДУ Уладзімірам Смірновым і яго малодшым братам, студэнтам факультэта фізвыхавання нашага універсітэта Андрэем. Канчатковае размеркаванне месц вызначыў канкур. У ім выдатна выступіў малодшы з братоў — Андрэй, які набраў 1082 ачкі. Яго агульная сума — 5191 ачко і вышэйшая ўзнагарода.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра МПК выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту гэтай кафедры МЯРЭЖУ Валерыю Леанідавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ.

АЗ24002.
«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.
Заказ 931